УДК 37.013.42

# Фарміраванне патрыятызму і грамадзянскасці на ўроках беларускай мовы і літаратуры

**А. Л. Барчук,**
кандыдат педагагічных навук, дацэнт,
выдатнік адукацыі Рэспублікі Беларусь

## Уводзіны

У адпаведнасці з актуальнымі запатрабаваннямі часу галоўнай задачай устаноў адукацыі з’яўляецца падрыхтоўка адукаванага і творчага грамадзяніна, здольнага да пастаяннага развіцця і самаразвіцця. Сучасная педагогіка разглядае адукацыю як працэс, які накіраваны на самаразвіццё асобы маладога чалавека, на пашырэнне магчымасцей выбару свайго жыццёвага шляху.

Зразумела, што нельга навучыць чалавека, калі ён гэтага не жадае і не бачыць патрэбы ў набыцці ведаў. Вядомы педагог Л. В. Занкоў пісаў: “Усебаковае развіццё, духоўнае багацце не можа быць дасягнута па прымусу. Сапраўднае духоўнае багацце складаецца тады, калі чалавек сам цягнецца да ведаў, да навукі, да мастацтва” [7]. Таму перад кожным выкладчыкам стаіць пытанне: як вучыць, каб павысіць эфектыўнасць сучасных заняткаў, якія сродкі для гэтага неабходна падабраць? Даваць веды – задача складаная. Але яшчэ цяжэй дапамагчы маладому чалавеку дасягнуць такога ўзроўню, каб ён адчуў сябе творчай, актыўнай і патрэбнай асобай.

Як зрабіць заняткі беларускай мовы і літаратуры цікавымі і захапляльнымі, каб сапраўды ўзнікала жаданне пазнання нечага новага? Як выклікаць інтарэс да вывучэння роднай мовы? Выкарыстоўваючы свой вопыт, хачу сказаць наступнае: калі настаўнік на ўрочнай і ў пазаўрочнай працы

зможа раскрыць перад вучнёўскай моладдзю мілагучнасць беларускай мовы, яе вобразныя і выразныя сродкі, пакажа багацце слоўніка, з захапленнем будзе выкладаць свае прадметы, то і школьнікі, і студэнты будуць з цікавасцю вывучаць родную мову, пранікнуцца глыбокай любоўю да яе, а значыць і да свайго народа – творца і носьбіта гэтай мовы.

**Асноўная частка**

Рашэнне праблемы бачу ў актывізацыі пазнавальнай дзейнасці, якая забяспечвае ўдзел маладога чалавека ў працэсе навучання, а таксама прывівае любоў да прадмета. Галоўнай мэтай навучання, я лічу, з’яўляецца не толькі назапашванне пэўных ведаў, уменнняў, навыкаў, але і падрыхтоўка маладога чалавека да самастойнага выбару ў жыцці, рашэння задач, праблем, якія ў яго могуць узнікаць. Вопыт педагагічнай працы паказаў, што ў многіх навучэнцаў адсутнічае пазнавальны інтарэс на ўроках беларускай мовы і літаратуры. Менавіта таму кожны мой план заняткаў мае адну з галоўных мэт – актывізацыя пазнавальнай дзейнасці на ўроках роднай мовы, імкненне навучыць, зацікавіць, распаліць жаданне вывучаць прадмет глыбей. У сваёй працы праводжу комплекснае навучанне: развіццё мовы, мыслення, фарміраванне граматнасці і г.д.

Выхаваўчыя задачы на ўроках роднай мовы і літаратуры вырашаюцца не толькі праз фарміраванне цікавасці да прадмета, але і праз адпаведны дыдактычны матэрыял. Вучні ў час працы з вучэбнымі тэкстамі, у якіх расказваецца пра Беларусь, яе гісторыю, пра нашых продкаў, прыроду, родную зямлю і г.д., далучаюцца да гісторыі, духоўнай культуры свайго народа, яго традыцый, звычаяў і здабыткаў. Немагчыма аддзяліць, напрыклад, любоў да Радзімы ад любові да прыроды. Трэба імкнуцца навучыць моладзь аднолькава любіць вялікія азёры і маленькія рачулкі, магутныя дубы і кволыя раслінкі. Атаясамліваючы сябе з гэтай культурай, яны фарміруюць свой светапогляд. У іх выхоўваецца нацыянальная самасвядомасць.

На занятках практыкую розныя формы дзейнасці:

- індывідуальныя творчыя заданні;

- работа ў парах і групах;
- віктарыны, конкурсы;
- праца з тэкстамі;
- самастойная работа з падручнікам і дадатковай літаратурай;
- пераклады з рускай мовы на беларускую,
- напісанне водгукаў, міні-сачыненняў,
- рознаўзроўневыя заданні,
- урок-гульня;
- урок-падарожжа;
- праблемны ўрок;
- урок-залік;
- урок-суд.

Метады, прыёмы работы па развіцці творчых здольнасцей навучэнцаў:

- творчыя пераказы са зменай асобы расказчыка;
- вуснае славеснае маляванне;
- адказы на пытанні праблемнага характару;
- разгляд кампазіцыі мастацкага твора;
- супастаўленне літаратурных твораў розных аўтараў;
- супастаўленне дадзенага твора з іншымі творамі пісьменніка;
- напісанне ўласных мастацкіх твораў.

Дзякуючы такім заданням я змагла зацікавіць вучнёўскую моладзь і арганізаваць гурток “Жывое слова”, дзе мы пішам і чытаем свае вершы, апавяданні.

Пераклад з рускай мовы на беларускую не толькі садзейнічае развіццю маўленчай мабільнасці, адчуванню слова, але гэта яшчэ і дзейсны сродак выхавання (вельмі важна падабраць прыгожыя, цікавыя тэксты, якія будуць абуджаць у вучняў любоў да роднага, нашага, беларускага).

Асаблівую ўвагу, я лічу, трэба надаваць пазакласнай працы па беларускай мове і літаратуры. Менавіта пазакласная праца – арганічная частка навучальна-выхаваўчага працэсу ў школе, яна паглыбляе веды, уменні і

навыкі, атрыманыя на ўроках; вучыць самастойна працаваць з кнігай, з даведачнай літаратурай; развівае творчыя здольнасці; узбагачае слоўнікавы запас; выхоўвае пашану да роднага слова.

Нельга абысці яшчэ адну тэму – Вялікая Айчынная вайна, якая мае важнае значэнне ў выхаванні патрыятызму моладзі. Як пісаў У. Караткевіч, “любоў да Радзімы абуджае перш за ўсё гісторыя” [10]. Перад вывучэннем адпаведнай тэмы можна зрабіць экскурс у гісторыю. Неабходна даць вучням цікавыя, хвалюючыя звесткі пра Вялікую Айчынную вайну, каб яны ў поўнай меры змаглі ацаніць веліч подзвігу нашага народа, глыбіню духоўных пакут і матэрыяльных страт. Нават сухія звесткі аб тым, што ў вайне загінуў кожны чацвёрты беларус (а цяпер гісторыкі лічаць, што кожны трэці), знішчана 4885 і спалена 627 вёсак, разбурана 209 гарадоў і 9200 вёсак, дапамагаюць вучням адчуць, якім вялікім горам стала вайна для нашай краіны і для кожнай беларускай сям’і. Абавязкова звяртаюся да асабістага вопыту вучняў з просьбай расказаць або даведацца ў бацькоў, бабуль і дзядуль, родных, суседзяў, як закранула вайна іх, іх сваякоў, знаёмых, якія страты панеслі іх сем’і падчас таго страшнага ліхалецця. Каб паказаць, што ўсеагульнай была барацьба супраць ворага, можна паведаміць наступныя гістарычныя факты і лічбы: супраць фашыстаў змагалася 374000 партызан, існавала 2515 партызанскіх атрадаў, 462 беларусы ўдастоены звання Героя Савецкага Саюза. Пасля знаёмства з падобнай інфармацыяй у падлеткаў ўзнікае адчуванне таго, што ўдзел нашай краіны ў вайне – гэта незабыўная гісторыя. Для стварэння адпаведнай атмасферы на ўроку выкарыстоўваюцца запісы музычных твораў, вядомых песень, вершаў пра вайну. Музыка стварае светла-журботны настрой, абуджае пачуцці моладзі, дапамагае ўнутрана настроіцца на ўспрыняцце матэрыялу, дакрануцца душой да тых трагічных падзей.

Менавіта мужнасць, адвага, моц духу ў гады Вялікай Айчыннай вайны праявіліся з небывалай сілай, учынкі воінаў пераканаўча тлумачаць, што такое патрыятызм, які, як і ва ўсе цяжкія часы, у гады вайны асабліва аб'ядноўваў людзей, надаваў ім сілу і веру ў шчаслівую будучыню сваёй краіны, у

перамогу. Мы не павінны забываць урокаў той страшнай вайны. Наша задача – данесці гэтыя факты да моладзі для таго, каб не вырасла пакаленне, якое забывае свае карані, сваю гісторыю. Каб яны памяталі, што сёння самае галоўнае на нашай зямлі ды і ва ўсім свеце – гэта мір.

Такім чынам, вывучэнне тэмы вайны на ўроках беларускай літаратуры дазваляе фарміраваць патрыятычныя пачуцці, выхоўваць вучнёўскую моладзь сапраўднымі грамадзянамі Беларусі, паважаць мінулае свайго народа і памятаць яго, берагчы і шанаваць свой родны край.

Правядзенне моўных свят, прадметнага тыдня, вечароў, экскурсій, дыспутаў, віктарын, конкурсаў, выданне газет, напісанне дакладаў, рэфератаў – усё гэта садзейнічае патрыятычнаму, грамадзянскаму выхаванню моладзі. У час правядзення Тыдня беларускай мовы і літаратуры, прысвечанага Міжнароднаму дню роднай мовы, можна з вучнямі правесці наступныя мерапрыемствы:

- акцыя “Пагавары са мной на роднай мове ”;
- віктарыны “Размаўляем па-беларуску!”; “Ці ведаем родную мову?”; “Давайце размаўляць на нашай мове!”;
- круглыя сталы на тэмы: “Скарб душы”, “Пагавары са мной на мове, на нашай роднай, не чужой”;
- гульня “З павагай да роднай мовы!”, “Вандроўка па родным краі”;
- турнір “Знаўца беларускай мовы”;
- выстава-прэзентацыя “Беларускія пісьменнікі”;
- гульня-конкурс “Скарб народа беларускага”;
- афармленне газет, прысвечаных Міжнароднаму дню роднай мовы;
- конкурс чытальнікаў уласных вершаў.

Невыпадкова мастацкую літаратуру называюць гісторыяй у вобразах. У працэсе навучання беларускай літаратуры на канкрэтных прыкладах можна выхоўваць у вучняў пачуццё гонару за Радзіму, народ, адданасць роднаму краю, павагу да тых, хто змагаўся за яе свабоду, незалежнасць і росквіт. Дапамагаючы глыбей пазнаць жыццё праз празаічныя і вершаваныя творы, у

тым ліку і пейзажнай тэматыкі, літаратура адначасова спрыяе самасцвярджэнню навучэнца як асобы, які адчувае сябе часткай прыроды, адчувае адказнасць за свае ўчынкі ў адносінах да навакольнага асяроддзя.

Выхаванне нацыянальнай свядомасці моладзі можна працягваць і на так званых біяграфічных уроках, дзе вывучаецца жыццёвы і творчы шлях пісьменнікаў. Знаёмства з жыццём і літаратурна-грамадскай дзейнасцю такіх выдатных дзеячаў старажытнасці, як Ефрасіння Полацкая, Францыск Скарына, Мікола Гусоўскі абуджае ў навучэнцаў пачуццё гонару за нашых далёкіх продкаў і іх справы.

На сучасным этапе выхаванне грунтуецца на агульначалавечых, гуманістычных каштоўнасцях, культурных і духоўных традыцыях беларускага народа, адлюстраванні інтарэсаў асобы, грамадства і дзяржавы. І сапраўды гэта так, бо клапаціцца пра выхаванне грамадзяніна і патрыёта сваёй краіны, свядомага прадстаўніка нацыі – значыць дбаць пра будучыню роднага краю. Таму пачэсны абавязак выкладчыка беларускай мовы і літаратуры – фарміраваць ў падрастаючага пакалення пачуццё прыналежнасці і далучанасці да беларускай дзяржавы і грамадства, актыўную грамадзянскую пазіцыю, патрыятызм, нацыянальную самасвядомасць, дапамагчы асэнсаваць сваю далучанасць да таго, што адбывалася, адбываецца і, самае галоўнае, будзе адбывацца на нашай беларускай зямлі, каб навучэнцы адчулі сябе яе часткай, сапраўднымі грамадзянамі сваёй Бацькаўшчыны, так як беларуская мова і літаратура з’яўляюцца не толькі вучэбнымі прадметамі, але і сродкам выхавання, развіцця. Ужо сам праграмны матэрыял мае ў сабе неабмежаваныя магчымасці для выхавання любові і сур’ёзных адносінаў да ўсяго, што з’яўляецца родным, беларускім, нацыянальным.

**Заключэнне**

Выкарыстанне разнастайных метадаў, сродкаў і форм навучання на занятках беларускай мовы і літаратуры спрыяе таму, каб кожны ўрок меў сваё выхаваўчае аблічча, свой маральна-эстэтычны лейтматыў, накіраваны на выхаванне каштоўнасных адносін да жыцця.

Гэта справа доўгая, яна патрабуе ад выкладчыка настойлівасці, паслядоўнасці і вялікага цярпення. Гэта шматбаковая, шматмэтавая педагагічная дзейнасць, сутнасць якой заключаецца ў фарміраванні асобы, здольнай прынесці карысць грамадству. А для гэтага неабходна дапамагчы навучэнцам не страціць жыццёвыя арыенціры, якія базіруюцца на маральным імператыве, на пачуцці патрыятызму і грамадзянскай адказнасці, – місіі патрыятычнага і грамадзянскага выхавання, здзяйсненне якой забяспечыць згоду, стабільнасць, устойлівасць развіцця ў цяперашнім і будучым жыцці.

**Літаратура**

1. Буткевіч, В. В. Патрыятычнае выхаванне навучэнцаў: гісторыя і сучаснасць / В. В. Буткевіч. – Мінск: Нац. ін-т адукацыі, 2010.

2. Гессен, С. И. Основы педагогики. Введение в прикладную философию / С. И. Гессен // М.: Школа-Пресс, 1995. – 448 с.

3. Грымаць, А. А. Фарміраванне маральных ідэалаў школьнікаў / А. А. Грымаць. – Мінск: Геомант, 2000. – 446 с.

5. Ершова, О. И. Патриотическое воспитание учащихся: современные цивилизационные вызовы и перспективы / О. И. Ершова // Веснік адукацыі. – 2021. – № 1. – С. 21–29.

6. Жук, О. Л., Захарова, С. Н. Воспитание гражданское / О. Л. Жук, С. Н. Захарова // Белорусская педагогическая энциклопедия: в 2 т. – Мінск: Адукацыя і выхаванне, 2015. – Т. 1. – С. 245–246.

7. Занков, Л. В. Избранные педагогические труды / Л. В. Занков. – 3-е изд., дополн. – М.: Дом педагогики, 1999. – 608 с.

8. Колас, Я. Методыка роднай мовы // Збор твораў: У 14 т. – Т.12 / Я. Колас. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1976. – 457 с.

9. Парфёнова, Л. А. Мировоззренческая составляющая государственного регулирования воспитательного и образовательного процессов / Л. А. Парфёнова // Адукацыя і выхаванне. – 2016. – № 1. – С. 50–64.

10. Русецкі, А. У. Уладзімір Караткевіч: Яго зорка не згасне ніколі… / А. У. Русецкі // Віцебск: ВДУ імя П. М. Машэрава, 2020. – 394 с.
11. Ушинский, К. Д. Собрание сочинений: В 11 т. / К. Д. Ушинский. – М.-Л: Изд-во Акад. пед. наук РСФСР, 1950. Т. 9: Человек как предмет воспитания. – 628 с.
12. Чечет, В. В., Чечет, В. Викт. Педагогика в афоризмах и изречениях/ В. В.Чечет, В. Викт. Чечет. – 3-е изд., доп. и перераб. – Минск: Аверсэв, 2013. – 110 с.

**Анатацыя**

Артыкул прысвечаны актуальным пытанням фарміравання патрыятычных і грамадзянскіх якасцей у вучнёўскай моладзі ў працэсе вывучэння беларускай мовы і літаратуры; паказана метадычнае суправаджэнне працы выкладчыка беларускай мовы і літаратуры ва ўстановах адукацыі для фарміравання патрыятычнай і грамадзянскай свядомасці маладога пакалення.

У працы засяроджваецца ўвага на адзінстве маральных і эстэтычных аспектаў у грамадзянска-патрыятычным выхаванні вучнёўскай моладзі. Разглядаюцца патрыятызм, грамадзянскасць у дыялектычным адзінстве нацыянальнага, агульначалавечага і індывідуальнага.

Паказана выхаваўчая функцыя грамадзянска-патрыятычнай свядомасці, якая накіравана на фарміраванне ўстановак асобы і сацыяльнай групы сродкамі ўсіх дзяржаўных, грамадскіх і палітычных інстытутаў, выхаванне патрыётаў, накіраваных на канструктыўна-пераўтваральную дзейнасць.

**Annotation**

The article is devoted to topical issues of the formation of patriotic and civil consciousness of schoolchildren in the process of studying the Belarusian language and literature; the methodological support of the work of the teacher of the Belarusian language and literature in educational institutions on the formation of patriotic and civic consciousness of the young generation is shown.

The work focuses on the unity of moral and aesthetic aspects in the civil-patriotic education of schoolchildren. Patriotism, citizenship in the dialectical unity of national, universal and individual are considered.

The educational function of civil-patriotic consciousness is shown, which is aimed at forming the views of the individual and social group through the means of all state, public and political institutions, the education of patriots aimed at creative and transformative activities.